ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ



№ 1 (994) | ЧАЦВЕР, 11 студзеня 2001 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## НА САВЕЦЕ УНІВЕРСІТЭТА

У апошні чацвер снежня адбылося заключнае ў мінулым годзе пасяджэнне Савета універсітэта. Першым на яго парадку дня стаяла пытанне аб выніках работы спартыўнага клуба ГДУ ў 2000 г. Як вядома, гэта быў год чарговых летніх Алімпійскіх гульняў, якія прайшлі ў аўстралійскім горадзе Сіднеі. Заканамерна, што ўсе спартсмены імкнуліся азнаменаваць гэтую гістарычную падзею сваімі вышэйшымі дасягненнямі. У цэлым, як зазначыў дырэктар спартклуба Б.М.Гіль, паспяховымі выступленнямі вызначыліся на розных спаборніцтвах і студэнты нашага універсітэта. І заканамерна, што работа яго спартклуба за мінулы год прызнана здавальняючай.

Па інфармацыі прарэктара па навуковай рабоце прафесара Д.Р.Ліна прынята рашэнне аб адкрыцці пры ГДУ, як яго структурнага падраздзялення, Навукова-даследчага інстытута экалогіі.

На конкурснай аснове на пасаду прафесара кафедры агульнай фізікі выбраны доктар тэхнічных навук, прафесар В.Р.Пінчук. Загадчыкам кафедры спартыўных дысцыплін абраны кандыдат псіхалагічных навук, дацэнт Б.М.Зайцаў.

Савет прыняў рашэнне аб рэкамендацыі кандыдатаў эканамічных навук В.А.Мінчанка і В.В.Кавальчук з кафедры бухуліку, кантролю і аналізу гаспадарчай дзейнасці, кандыдата філалагічных навук А.М.Воінавай з кафедры беларускай мовы на прысваенне вучонага звання дацэнта.

На Савеце былі разгледжаны таксама некаторыя іншыя пытанні універсітэцкага жыцця.

## ПЕРШАЙ ЭКЗАМЕНАЦЫЙНАЙ СЕСІІ XXI СТАГОДДЗЯ — ВЫДАТНЫЯ ВЕДЫ



Навагодні святы яшчэ працягваюцца, але студэнтам цяпер ужо не да іх — пачаліся экзамены. Галоўным болем для юнакоў і дзяўчат становіцца зараз неабходныя канспекты лекцый і падручнікі, а не прысмакі да навагодняга стала, за якім сустрэты новае стагоддзе і трэцяе тысячагоддзе.

Гарачая пара сесіі адчуваецца ў чытальных залах, бібліятэках, інтэрнатах, дзе ў суседнім пакоі можна пазычыць у аднакурсніка на адну ноч жаданы канспект, якога па тых ці іншых прычынах у самога не аказалася.

Падрабязна і дэталёва сказаць аб выніках выпрабаванняў студэнтаў на веды гаварыць пакуль што рана: экзамены на большасці факультэтаў пачаліся з 5 студзеня, за выключэннем студэнтаў-пяцікурснікаў, якія гэты чарговы бар'ер ужо хто больш, хто менш паспяхова пераадолелі, а таксама студэнтаў геафака спецыяльнасці "Геалогія і разведка карысных выкапняў". Па словах дэкана факультэта Г.А.Сербіна экзамены тут вытрыманы на ўзроўні.

Варыянт начнога "штурму" з кавай падручнікаў і канспектаў — не адзін з лепшых для студэнтаў, спадзяванні на шпаргалкі — справа таксама не надзейная. Таму застаецца адно: максімальна плённа працаваць у адведзеныя на падрыхтоўку да экзамена дні, тады і білет можа трапіць шчаслівы...

## "МІС ГОМЕЛЬ-2001" — СТУДЭНТКА ГДУ

Напярэдадні навагодніх святаў у абласным грамадска-культурным цэнтры прайшоў фінал конкурсу "Міс Гомель-2001". У ім прынялі ўдзел 10 прыгажунь з г.Гомеля і вобласці, якія ў самых розных конкурсах аспрэчвалі карону пераможцы.

Шматлікія гледачы, якія сабраліся ў зале, убачылі па-сапраўднаму непаўторную, цікавую і захапляючую праграму конкурсу. Кожная з дзяўчат, якую рыхтавалі да яго цырульнікі, візажысты, харэограф, імкнулася найбольш поўна праявіць свае самыя разнастайныя здольнасці.

Журы вызначыла лепшых у розных намінацыях: "Міс Фота", "Міс Зачараванне", "Міс Шарм" і інш. А вышэйшы тытул — "Міс Гомель-2001" быў прысуджаны студэнтцы нашага універсітэта другакурсніцы эканамічнага факультэта Аксане Стральцовай. Карону пераможцы ёй надзела "Міс Гомель-2000" Кацярына Цакунова, а старшыня аргкамітэта конкурсу, начальнік упраўлення культуры аблвыканкама Аляксандр Прусаў уручыў статуэтку багіні перамогі — крылатай Нікі.

Першай "Віцэ-міс Гомель-2001" стала вучаніца адной з гомельскіх школ Наталля Валошка.

Аксана і Наталля прымуць удзел у III Нацыянальным конкурсе "Міс Беларусь-2001", на якім будуць прадстаўляць нашу вобласць. Рыхтавацца да ўдзелу ў рэспубліканскім конкурсе яны будуць у г.Мінску, у Нацыянальнай школе прыгажосці.

Т.НІКАЛАЕВА.

## Да ўвагі абітурыентаў — 2001!

## ЭКСПЕРЫМЕНТ НА ЎСТУПНЫХ ЭКЗАМЕНАХ

З ведама Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь сёлета ў некаторых вышэйшых навучальных установах краіны, у тым ліку і ў нашым універсітэце, будзе праводзіцца эксперымент па прыёму ўступных экзаменаў па асобных дысцыплінах. Веды абітурыентаў прадугледжваецца ацэньваць па 10-бальнай сістэме. А на такія спецыяльнасці ГДУ як "Аўтаматызаваныя сістэмы апрацоўкі інфармацыі", "Геалогія і разведка карысных выкапняў" узровень ведаў жадаючых вучыцца ў нашым універсітэце будзе вызначацца шляхам тэсціравання.

## АДКРЫТЫ НДІ ЭКАЛОГІІ

На мінулым тыдні, у пятніцу, адбылося ўрачыстае адкрыццё Навукова-даследчага інстытута экалогіі пры нашым універсітэце — першага пры ім структурнага падраздзялення такога ўзроўню.

У сваім выступленні рэктар ГДУ прафесар, член-карэспандэнт Беларускай акадэміі адукацыі М.В.Селькін адзначыў важнасць такога навуковага падраздзялення ў вядучай вышэйшай навучальнай установе Беларускага Палесся ў правядзенні і развіцці навуковых даследаванняў па экалогіі, прадухіленні тэхнагенных наступстваў чарнобыльскай катастрофы. Міхаіл Васільевіч пазнаёміў прысутных з назначаным на пасаду дырэктара НДІ экалогіі доктарам сельскагаспадарчых навук А.Ф.Карпенкам.

Пры адкрыцці НДІ выступіў таксама прарэктар па навуковай рабоце прафесар Д.Р.Лін. Затым былі разгледжаны галоўныя напрамкі пачатковай дзейнасці адкрытага навуковага падраздзялення універсітэта.

## ПЕРАМОЖЦЫ АБЛАСНОГА КОНКУРСУ

Падведзены вынікі конкурсу Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта па падтрымцы найбольш таленавітых маладых вучоных і спецыялістаў за 2000 год.

У намінацыі па выкананню дзяржаўных і рэгіянальных навукова-тэхнічных праграм сярод пераможцаў конкурсу — навуковы супрацоўнік праблемнай навукова-даследчай лабараторыі нашага універсітэта У.Я.Гайшун.

У намінацыі па выкананню прыкладных распрацовак у ліку пераможцаў начальнік аддзела ІВЦ ГДУ А.А.Федарцоў.

Пераможцы абласнога конкурсу маладых вучоных і спецыялістаў удастоены грашовых прэмій.

## ВІНШУЕМ!

*Кандыдат эканамічных навук дацэнт кафедры эканамічнай інфарматыкі і аўтаматызаваных сістэм кіравання КОТАЎ Геній Клаўдзіевіч выбраны акадэмікам Беларускай акадэміі сацыяльных навук. Дыплом акадэміка яму ўручаны ва ўрачыстай абстаноўцы 28 снежня мінулага года на пасяджэнні Савета універсітэта.*

### Канферэнцыі

## ДЛЯ АДРАДЖЭННЯ І ЗАХАВАННЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ



У дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы ў Мінску прайшлі V Міжнародныя Купалаўскія чытанні "Янка Купала і праблемы беларускага самапазнання". У канферэнцыі прымалі ўдзел знакамітыя вучоныя нацыянальнай культуры з Беларусі, Польшчы, Латвіі, Расіі, а таксама выкладчыкі кафедры беларускай літаратуры нашага універсітэта: прафесар І.Ф.Штэйнер, дацэнт С.І.Ханеня і аўтар гэтых радкоў. Чытанні засведчылі высокі ўзровень развіцця сучаснага купалазнаўства, і ў прыватнасці, аднаго з яго прыярытэтных кірункаў, які на падставе творчасці песняра спрабуе выявіць асаблівасці нацыянальнага светабачання як у сінхронным, так і ў дыяхронным кантэксце.

* * *

Трэцяя Міжнародныя чытанні "Ян Баршчэўскі: дыялог з часам і ў часе", якія праходзілі некалькімі днямі пазней у Віцебску, сталіся значным унёсам у вывучэнне спадчыны слыннага пісьменніка XIX стагоддзя. Канферэнцыя, сярод удзельнікаў якой былі загадчык кафедры беларускай літаратуры ГДУ прафесар І.Ф.Штэйнер і аўтар гэтага паведамлення, ладзілася на базе Віцебскага дзяржаўнага універсітэта імя П.М.Машэрава, кіраўніцтва якога выказала надзвычайную зацікаўленасць і разуменне важнасці правядзення падобных навуковых сустрэч. Сапраўдны клопат у адраджэнні і захаванні нацыянальнай культуры выявіў у сваім прывітальным слове доктар гістарычных навук, рэктар А.У.Русецкі, а таксама кандыдат біялагічных навук, першы прарэктар А.М.Дарафееў, які падсумоўваючы вынікі чытанняў, дакладна і прафесійна акрэсліў перспектывы далейшых даследаванняў жыцця і творчасці знакамітага ўраджэнца Віцебшчыны.

Ю.САЛЬНІКАВА,
асістэнт кафедры беларускай літаратуры.

## З УЗНАГАРОДАЙ!

За шматгадовую плённую вучэбную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці старшы выкладчык кафедры беларускай літаратуры **ГЕНАШ Вера Савельеўна** ўзнагароджана Ганаровай граматай універсітэта.

За шматгадовую плённую вучэбную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці старшы выкладчык кафедры тэорыі і практыкі англійскай мовы **АКУЛІЧ Людміла Давыдаўна** ўзнагароджана Ганаровай граматай універсітэта.

За шматгадовую добрасумленную працоўную дзейнасць, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і ў сувязі з 60-годдзем з дня нараджэння лабарант кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту **ЮШЧЫНСКІ Анатоль Эдуардавіч** ўзнагароджаны Ганаровай граматай універсітэта.

За шматгадовую добрасумленную працоўную дзейнасць, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці дацэнт кафедры ўсходнеславянскіх народаў **СЯМЕЙНЫХ Зоя Мацвееўна** ўзнагароджана Ганаровай граматай універсітэта.

## "ЮРЬЕВ ДЕНЬ" ДЛЯ ВЫПУСКНИКОВ

Внесены изменения в постановление Совета Министров № 276 от 2 апреля 1997 г. "О распределении выпускников государственных высших и средних специальных учебных заведений". Обязательное распределение, к сожалению, пока не отменили, но в практике "отработки" появились послабления. Теперь молодым специалистам со средним специальным образованием можно по собственной воле поступать на дневные отделения вузов, а с высшим — в очную аспирантуру и ординатуру. И, соответственно, в связи с этим увольняться без согласования с начальством. Также разрешено увольнять молодых специалистов с их согласия в порядке перевода на другую работу (но в этом случае согласие с работодателем должно быть обоюдным). Разумеется, каждый по-прежнему вправе, выбирая работу, руководствоваться конституционной нормой о свободном выборе профессии, рода занятий и работы — а все вытекающие из постановления Совмина неудобства оспаривать в суде.

("Аргументы и факты в Беларуси").

# ЗДАРОЎЕ — НАШ АГУЛЬНЫ КЛОПАТ

**Святы праходзяць хутка, зноў уступаюць месца будзённым справам. Адшумелі навагоднія вечары, балі і дні студэнцтва. У іх цяпер адзінае жаданне — паспяхова вытрымаць выпрабаванні зімовай экзаменацыйнай сесіі. Зноў наступілі і бяссонныя ночы над падручнікамі і канспектамі, і хваляванні за адзнакі, якія з'явяцца ў залікоўках. Але як бы там ні было (камусьці пашанцуе больш, калі сістэматычна займаўся на працягу семестра, і наадварот), пасля турботных дзён сесіі ў студэнтаў наперадзе — такія доўгачаканыя канікулы. Як і дзе іх правесці, каб па-сапраўднаму набрацца сіл і здароўя, ужо загадзя паклапаціліся ў прафкоме студэнтаў. Аб гэтым па просьбе карэспандэнта нашай газеты расказвае яго старшыня Н.І.КОЛТЫШАВА:**

— Перш за ўсё неабходна адзначыць, што здароўе моладзі — гэта будучыня нацыі. Па дадзеных жа Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, як гэта ні сумна гучыць, студэнцтва прызнана групай рызыкі. Не сакрэт, што "наступаюць" на яго СНІД, наркаманія, а ў нашым рэгіёне сур'ёзна пагражае стану здароўя маладых яшчэ і радыяцыя. Вось чаму ўсе намаганні Упраўлення па аздараўленні і санаторна-курортнаму лячэнню насельніцтва Гомельскай вобласці, аналагічнай камісіі нашага універсітэта, прафкома студэнтаў накіраваны на тое, каб наша моладзь мела рэальныя шанцы ўмацоўваць стан свайго здароўя.

Хочацца адрасаваць словы ўдзячнасці Упраўленню па аздараўленні і санаторна-курортнаму лячэнню вобласці, якое ўзначальвае Валянціна Васільеўна Драздова. Яго работнікі ўдзяляюць належную ўвагу здароўю студэнцкай моладзі. Так, у мінулым годзе было арганізавана мэтавае аздараўленне юнакоў і дзяўчат чатырох ВНУ Гомельшчыны — ГДУ, медінстытута, тэхнічнага універсітэта імя П.О.Сухога, Мазырскага педінстытута імя Н.К.Крупскай. На зімовых канікулах многія нашы студэнты на працягу дванаццаці дзён мелі магчымасць адпачываць у пансіянатах "Залатыя пяскі", "Пунсовыя ветразі", санаторыі-прафілакторыі "Электрон", што пад Мінскам, і інш.

Атрымалі санаторныя пуцёўкі звыш 20 студэнтаў ГДУ ва ўзросце да 18 гадоў, прычым, лячыліся яны не толькі ў межах Беларусі, але і на вядомых курортах у Сочы, Саках, Анапе, Трускаўцы.

Асаблівы наш клопат — маладыя маці-студэнткі. Са сваімі дзеткамі яны лячыліся і адпачывалі ў рэспубліканскіх здраўніцах "Алеся", "Белыя росы", "Нарач", "Прыдняпроўскі", "Крыніца" і інш.

Мэтанакіравана вялася работа па аздараўленню студэнтаў і летам. У санаторыях, дамах адпачынку, пансіянатах, на турбазах вобласці, рэспублікі, на Чарнаморскім узбярэжжы змаглі правесці летнія канікулы каля 200 студэнтаў нашага універсітэта. Усяго за мінулы год студэнтам было выдзелена звыш 50 санаторных пуцёвак.

З фінансавай дапамогай абласнога Упраўлення па аздараўленні і санаторна-курортнаму лячэнню ў ліпені ва ўрочышчы Чонкі дзейнічала база адпачынку для 150 студэнтаў біяфака і факультэта фізічнай культуры. Будучыя біёлагі мелі магчымасць прайсці ў гэтых мясцінах і вучэбную практыку.

На гэтыя ж зімовыя канікулы абласным Упраўленнем па аздараўленні і санаторна-курортнаму лячэнню зноў запланавана мэтавае аздараўленне студэнцтва вобласці як на тэрыторыі Гомельшчыны, так і рэспублікі. Жадаючыя атрымаць пуцёўкі, могуць звяртацца да прафоргаў сваіх факультэтаў і сачыць за інфармацыяй на дошках аб'яў у карпусах.

Ад імя кіраўніцтва нашага універсітэта, прафкома студэнтаў хачу выказаць надзею, што плённае супрацоўніцтва з абласным Упраўленнем па аздараўленні і санаторна-курортнаму лячэнню будзе працягвацца. Бо задача ў нас агульная — клопат аб здароўі моладзі.

**Круглы стол**

# ЯКОГА НАСТАЎНІКА ЧАКАЕ СЁННЯ ШКОЛА?

Нядаўна адбылася сустрэча студэнтаў II і IV курсаў філалагічнага факультэта з настаўнікамі сярэдніх школ г.Гомеля і вобласці. Яе ініцыятары — вядомыя метадысты В.А.Ляшчынская і В.І.Смыкоўская, якія адзначылі вялікую ролю і неабходнасць "пераемнасці традыцый старэйшага пакалення настаўнікаў малодшым".

У абмеркаванні праблемы "Якім жа сёння павінен быць настаўнік?" прынялі ўдзел Г.І.Язвінская (СШ № 55 г.Гомеля), Л.І.Каешка (Торфазаводская СШ), К.А.Мохарава (СШ № 52 г.Гомеля), Н.М.Сакалова (Брылёўская СШ Гомельскага раёна), А.В.Быкоўская (СШ № 28 г.Гомеля), інш.

У ходзе сустрэчы адзначаліся недахопы, адмоўныя бакі сённяшняй школы, абыякавае стаўленне некаторых маладых настаўнікаў да сваёй працы. Але разам з тым падкрэсліваўся і той факт, што толькі школа зараз займаецца сапраўдным выхаваннем дзяцей, дапамагае "цяжкім" дзецям пераадолець іх праблемы, а гэтаму спрыяе асабісты падыход настаўнікаў да кожнага вучня. Кожны настаўнік, які валодае "дарам аддаваць", павінен правільна ім карыстацца, бо "дабрыня — асноўны ключ да сэрца дзіцяці".

Мэтазгоднасць такіх сустрэч відавочная і карысная для будучых педагогаў, бо настаўнікі старэйшага пакалення і больш трывалага вопыту не толькі давалі каштоўнейшыя парады сваім будучым калегам, але і дзяліліся сваімі новымі метадычнымі распрацоўкамі, што, спадзяёмся, будзе скарыстана сённяшнімі студэнтамі ў далейшай педагагічнай практыцы.

Напрыканцы сустрэчы нашы студэнты А.Селіванава, С.Харшуноў, А.Мядзведзева і Г.Мельнік выказалі словы ўдзячнасці гасцям і спадзяванне на будучае супрацоўніцтва. Бо без карысных метадычных парад нашых выкладчыкаў ва універсітэце і дапамогі на практыцы калег у школе складана будзе прайсці гэты цяжкі і доўгі шлях да таго, каб звацца "сапраўднымі настаўнікамі".

**К.СВЯРДЛОВА,**
**студэнтка гр. БА-43**
**філалагічнага факультэта.**

# ВЕДАЮЦЬ ЦАНУ ПРЭСЫ

Напрыканцы апошняга ў XX стагоддзі месяца адміністрацыя свабоднай эканамічнай зоны "Гомель-Ратон" правяла сустрэчу з работнікамі сродкаў масавай інфармацыі рэспублікі, вобласці і нашага горада. Былі аб'яўлены вынікі штогадовага конкурсу на лепшае асвятленне дзейнасці СЭЗ і ўручаны медалі і грашовыя прэміі яго пераможцам.

За актыўную інфармацыйную падтрымку ў справе станаўлення і развіцця СЭЗ "Гомель-Ратон" рэдактар газеты "Гомельскі універсітэт" удастоены падзячнага ліста.

Аб'яўлены чарговы конкурс на лепшую публікацыю, мастацкі твор 2001 года аб СЭЗ "Гомель-Ратон" у сродках масавай інфармацыі. Яго дэвіз: "СЭЗ "Гомель-Ратон" — у XXI стагоддзе з навейшымі тэхналогіямі". У конкурсе могуць удзельнічаць рэдакцыйныя калектывы рэспубліканскіх, мясцовых і іншых газет, часопісаў, радыё і тэлебачання, прафесійныя журналісты, пазаштатныя аўтары, фотакарэспандэнты і фотааматары, пісьменнікі, паэты, мастакі, музыканты.

Конкурс працягнецца з 1 студзеня да 1 снежня 2001 года. Для яго пераможцаў па розных намінацыях устаноўлена 14 прэмій. Максімальныя: для рэдакцыйнага калектыву — 40 мінімальных зарплат, прафесійных журналістаў — 15 мінімальных зарплат, пазаштатных аўтараў — 10 мінімальных зарплат.

У праграму сустрэчы ўваходзіла прэс-канферэнцыя, якую правёў кіраўнік адміністрацыі СЭЗ "Гомель-Ратон" У.Ф.Бык. Ён падрабязна адказаў на ўсе пытанні аб станаўленні, праблемах і перспектывах развіцця свабоднай эканамічнай зоны.

# СЭЗ И ВУЗЫ: УТВЕРЖДЕНИЕ ТРАДИЦИЙ

Администрация СЭЗ "Гомель-Ратон" продолжает в нынешнем учебном году сотрудничество с гомельскими вузами в соответствии с заключенными договорами. Особое внимание мы обращаем на подготовку в вузах молодых кадров, способных успешно решать задачи, стоящие перед свободной экономической зоной в области развития рыночных отношений и внедрения новейших технологий.

В целях поощрения интереса студентов и преподавателей вузов к изучению проблем, связанных с деятельностью СЭЗ, в прошлом году были учреждены стипендии администрации СЭЗ "Гомель-Ратон". Они выплачивались студентам выпускных курсов, которые для написания своих дипломных проектов избрали тематику, связанную с функционированием СЭЗ, и имели хорошую и отличную успеваемость в течение пяти последних семестров. Стипендии выплачивались с марта по июнь в размере четырех минимальных заработных плат в дополнение к обычной студенческой стипендии.

Стипендиатами администрации СЭЗ "Гомель-Ратон" по рекомендациям советов университетов в прошлом учебном году были: Тамара Бородина, выпускница экономического факультета ГГУ имени Ф.Скорины, Федор Пашечко, студент 5-го курса гуманитарно-экономического факультета ГГТУ имени П.О.Сухого и Андрей Свидунович, выпускник факультета промышленного и гражданского строительства БелГУТа. В соответствии с утвержденным положением единовременные премии от администрации СЭЗ в размере шести минимальных зарплат получили научные руководители этих дипломных работ: доцент кафедры бухучета ГГУ Л.М.Кравец, ст. преподаватель ГГТУ М.О.Гиль и профессор БелГУТа И.Г.Малков.

Кроме того, среди остальных дипломников был проведен конкурс на лучший дипломный проект, написанный по проблематике СЭЗ. Конкурсная комиссия рекомендовала администрации СЭЗ отметить денежными премиями (в размере 4-х минимальных заработных плат) выпускника юрфака ГГУ Александра Янгуразова, выпускницу БелГУТа Светлану Королик и Юлию Гусеву, выпускницу ГГТУ имени П.О.Сухого. Премий также удостоены руководители их дипломных проектов: преподаватель ГГУ С.Г.Шулейко, профессор БелГУТа В.П.Бугаев и доцент ГГТУ Л.А.Минчукова.

Администрация СЭЗ "Гомель-Ратон" доводит до сведения студентов и преподавателей, что уже начинается процесс выдвижения кафедрами и факультетами претендентов на присуждение наших стипендий. Окончательное решение подведет Совет университета. Администрация поддержит устремления талантливых студентов и инициативных, творческих преподавателей.

Мы ждем на практику студентов и на стажировку преподавателей как в стенах администрации, так и на предприятиях СЭЗ "Гомель-Ратон". Желаю Вам успехов и плодотворного сотрудничества с администрацией СЭЗ в 2001 году.

**В.БЫК,**
**глава администрации**
**СЭЗ "Гомель-Ратон".**

**Інтэрв'ю**

# ДА АЛІМПІЙСКАГА П'ЕДЭСТАЛА — ШЛЯХ НЯЛЁГКІ

**Мы жывём ужо ў трэцім тысячагоддзі. Яно пакуль для нас нібыта белы, чысты ліст. Можа таму наша памяць яшчэ часта вяртае нас назад, у мінулы год, такі багаты на яркія і памятныя падзеі. Адна з іх — Алімпійскія гульні ў далёкай Аўстраліі, у якіх разам з іншымі спартсменамі Беларусі пашчасціла адстойваць гонар сваёй краіны і студэнтцы трэцяга курса факультэта фізічнай культуры ГДУ майстру спорту міжнароднага класа па веславанню на байдарках і каноэ Наталлі Бандарэнка. Яна згадзілася падзяліцца сваімі ўражаннямі аб Алімпіядзе ў г.Сіднеі.**

- Гэта мая першая ў жыцці Алімпіяда, так што параўноўваць яе ў мяне няма з чым. А самае першае ўражанне было, канешне, захапляючым. Адкрыццё і закрыццё Алімпіяды — гэта проста казка. Праграма была вельмі цікавай: паказвала нам наземны і водны свет Аўстраліі. Самы захапляючы момант — запальванне Алімпійскага агню. Арганізацыя і правядзенне спаборніцтваў былі на самым высокім узроўні.

- ***Наталля, як можна ацаніць месца правядзення спаборніцтваў па віду спорту, у якім ты выступала?***

- Весларны канал, дзе праходзілі спаборніцтвы, быў выдатны, адным з лепшых, дзе мне даводзілася выступаць. Праўда, знаходзіўся ён у 45 мінутах язды ад алімпійскай вёскі, але гэта кампенсавалася добра зладжанай сістэмай транспарту.

- ***Як жыхары Аўстраліі адносяцца да веславання?***

- У гэтай краіне нацыянальным відам спорту лічыцца плаванне, але калі ўлічваць тое, што вялікая колькасць гледачоў была на трыбунах і на фінал было вельмі цяжка купіць білет, веславанне з'яўляецца для аўстралійцаў цікавым відам спорту.

- ***А што можна сказаць аб спартсменах іншых краін, аб новых сусветных і алімпійскіх рэкордах, якіх на Алімпіядзе ў Сіднеі было вельмі шмат?***

- Так, рэкордаў хапала. Але ж на тое гэта і Алімпіяда. Кожны імкнецца паказаць лепшае, на што ён здольны. Але такую колькасць знакамітых спартсменаў я бачыла ўпершыню.

- ***Аўстралія — гэта іншы кантынент, розныя гадзінныя паясы. Як праходзіла акліматызацыя беларускіх спартсменаў?***

- Шчыра кажучы, я думала, што гэты працэс будзе адбывацца намнога цяжэй, але на справе атрымалася не так ужо і складана, як уяўлялася. Проста першыя дні хацелася спаць, а ноччу была бяссонніца. Мы прыехалі ў Аўстралію за тры тыдні да старту, таму мой арганізм прывык да аўстралійскага клімату.

- ***Наталля, у фінале вы былі шостымі. Як расцэньваеце сваё выступленне?***

- Мы вельмі доўга "ішлі" да гэтых спаборніцтваў. Стараліся, рыхтаваліся, "выйшлі" на вынік, які запланавалі. Не хапіла ўсяго крышачку, а наогул я задаволена нашым выступленнем, бо гэта была для мяне першая Алімпіяда.

- ***Не сакрэт, што ў спартсменаў шмат часу адымаюць зборы. Як жа сумяшчаеце вучобу ва універсітэце і спорт?***

- Так, вельмі цяжка сумяшчаць трэніроўкі, зборы, спаборніцтвы з вучобай ва універсітэце. Даводзіцца вельмі шмат працаваць з вучэбным матэрыялам самастойна. У мяне ёсць выдатныя сябры, якія дапамагаюць мне вырашаць гэтую праблему.

- ***Якія планы на наступныя Алімпійскія гульні, якія адбудуцца ў Грэцыі?***

- Пакуль не варта загадваць. Трэба трэніравацца, рыхтавацца і спадзявацца на поспех...

**Інтэрв'ю правялі**
**А.ЛІСАЕВІЧ, С.СКАЧКОВА,**
**студэнткі трэцяга курса**
**факультэта фізічнай**
**культуры.**



# ГДУ імя Ф.СКАРЫНЫ І РЭЧЫЦКІ ПЕДКАЛЕДЖ: ПЛЁННАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

Сучасная адукацыйная рэформа, якая праводзіцца ў нашай краіне, надае асобую, інтэгральную якасць пераемнасці паміж рознымі этапамі і ўзроўнямі навучання. Таму правядзенне напрыканцы снежня 2000 года на базе Рэчыцкага педагагічнага каледжа рэгіянальнага навукова-практычнага семінара "Пераемнасць навучання ў каледжы і ВНУ: праблема бесперапыннага адукацыйнага працэсу" было абумоўлена выключнай актуальнасцю данага пытання. У яго абмеркаванні разам з кіраўніцтвам і выкладчыкамі педкаледжа прынялі ўдзел і прадстаўнікі ГДУ імя Ф.Скарыны. На жаль, звузіла фармат сустрэчы, але не ступень значнасці разглядаемых праблем, адсутнасць запрошаных прадстаўнікоў упраўлення адукацыі Гомельскага аблвыканкама.

Трэба сказаць, што не выпадкова семінар прайшоў у названай сярэдняй спецыяльнай навучальнай установе. З 1995 года паміж ГДУ і Рэчыцкім педкаледжам развіваюцца і ўмацоўваюцца разнастайныя формы сувязей. І ўжо ёсць іх канкрэтныя вынікі. Лепшыя выпускнікі беларускага аддзялення каледжа маюць магчымасць працягваць сваю вучобу па адпаведнай спецыяльнасці ўжо на завочным факультэце універсітэта, прычым са скарочаным 4-гадовым тэрмінам навучання. У 1999 — 2000 навучальным годзе апрабавана сумеснае праходжанне фальклорнай практыкі ў Рэчыцкім раёне групы студэнтаў філалагічнага факультэта пад кіраўніцтвам дацэнта В.С.Новак з навучэнцамі і выкладчыкамі каледжа. Сёлета ўпершыню некалькі навучэнцаў з сярэдняй спецыяльнай установы выконваюць свае курсавыя праекты на кафедры беларускай мовы універсітэта пад навуковым кіраўніцтвам вопытных педагогаў. Універсітэцкімі выкладчыкамі ў каледжы чытаюцца цэлыя курсы, распрацоўваюцца адаптаваныя праграмы з улікам патрабаванняў, якія прад'яўляюцца сучаснай сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай школамі. У такога супрацоўніцтва ёсць яшчэ і сацыяльны фактар. Не сакрэт, што асноўную долю кантынгенту навучэнцаў т. зв. "правінцыйных" вучэбных цэнтраў складаюць юнакі і дзяўчаты з невялічкіх гарадоў і вёсак. Па розных прычынах часам нават самыя таленавітыя з выпускнікоў такіх навучальных устаноў усё ж застаюцца па-за сферай вышэйшай адукацыі. Таму кіраўніцтва ГДУ імкнецца стварыць такія ўмовы, каб кожны малады чалавек мог цалкам рэалізаваць свой інтэлектуальны патэнцыял менавіта тут, на палескай зямлі. Такая карпатлівая праца скіравана не толькі на сённяшні дзень, на пераадоленне "перыферыйнасці" ў адукацыі, але, безумоўна, і на перспектыву.

Гэта яшчэ раз пацвердзіў і семінар, на якім ГДУ прадстаўлялі дэкан філалагічнага факультэта дацэнт У.А.Бобрык, дэкан завочнага факультэта дацэнт М.Н.Мурашка, загадчык кафедры беларускай мовы прафесар А.А.Станкевіч, загадчык кафедры беларускай культуры дацэнт Дз.Дз.Паўлавец і аўтар гэтых радкоў.

Адкрыў работу семінара дырэктар Рэчыцкага педкаледжа У.І.Рабянок. Ва ўступным слове ён надзвычай высока ацаніў тыя трывалыя сувязі, што ўсталяваліся за апошнія гады паміж універсітэтам і каледжам, і акрэсліў вектары будучага супрацоўніцтва. Яго даклад нібы задаў высокапрафесійны, кампетэнтны ўзровень усяму далейшаму ходу сустрэчы. Перад усімі яе ўдзельнікі скіравалі сваю ўвагу не толькі на дасягненні ў пераемнасці бесперапыннага адукацыйнага працэсу, але не абмінулі і праблемных, "балючых" пытанняў. А тое, што яны ёсць, паказала выступленне дацэнта М.Н.Мурашкі. Дэкан завочнага факультэта, адзначыўшы ў цэлым грунтоўную падрыхтоўку выпускнікоў каледжа, рэкамендаваных у ВНУ, спыніўся і на аналізе даволі рэдкіх выпадкаў выключэння былых навучэнцаў каледжа з універсітэта. Спецыялісты прыйшлі да высновы, што максімальна пазбавіцца ад такога вымушанага "адсеву" дапаможа карэктаванне зместу адукацыі ў педкаледжы з улікам мэтанакіраванай падрыхтоўкі да вучобы ва універсітэце.

Прафесар А.А.Станкевіч звярнулася да праблемы фарміравання ў навучэнцаў і студэнтаў даследчых уменняў і навыкаў. Іх адсутнасць прыводзіць да з'яўлення і пашырэння навукова-творчага інфантылізму. Яго перманентнымі прыкметамі становяцца схематызм, прымітыўнасць, нават схаластычнасць мыслення, што, у сваю чаргу, значна зніжае верагоднасць асобаснага самавыяўлення. Але сёння само жыццё патрабуе ад чалавека актыўных форм атрымання і засваення ведаў. Таму ўдзельнікі семінара ўхвалілі намаганні педкалектыву каледжа па арганізацыі спрыяльных умоў і магчымасцей для самастойнага павышэння навучэнцамі сваіх прафесійных якасцяў. Дарэчы, створанае ў каледжы Навуковае таварыства ў кантэксце праблемы пераемнасці — гэта своеасаблівыя першыя крокі здольных юнакоў і дзяўчат да сур'ёзнай навукова-даследчай работы ўжо ў ГДУ, дзе гэтаму накірунку працы са студэнцкай моладдзю надаецца выключна вялікая роля.

Як на практыцы здзяйсняецца падрыхтоўка навучэнцаў каледжа да наступнай ступені навучання, можна было ўбачыць падчас наведвання факультатыўных заняткаў па беларускай мове, арганізаванага такім чынам, што госці маглі прыняць непасрэдны ўдзел ва ўроку, задаваць пытанні навучэнцам і ацаніць іх веды.

Прадэманстраваная ўдзельнікам семінара матэрыяльна-тэхнічная база каледжа пераканала ў тым, што гэта істотнае і арганічнае звяно ў забеспячэнні прынцыпу пераемнасці ў сістэме бесперапыннай адукацыі.

За "круглым сталом" на заключным этапе работы семінара дэкан філалагічнага факультэта дацэнт У.А.Бобрык адзначыў карыснасць і плённасць сувязей паміж дзвюма навучальнымі ўстановамі і падкрэсліў неабходнасць пашырэння межаў супрацоўніцтва. Так, выкладчыкі каледжа маглі б павышаць сваю прафесійную кваліфікацыю на стажыроўках пры універсітэцкіх кафедрах ці праз вучобу ў аспірантуры. Прынамсі, "першай ластаўкай" такога вопыту стала выкладчык каледжа В.А.Сурыновіч, якая вучыцца ў аспірантуры пры кафедры беларускай мовы (навуковы кіраўнік — прафесар А.А.Станкевіч). Прапанавана, каб некалькі лепшых студэнтаў-пяцікурснікаў філалагічнага факультэта накіроўваліся на педагагічную практыку ў каледж.

Семінар паказаў, што станоўчы вопыт супрацоўніцтва універсітэта і Рэчыцкага педкаледжа патрабуе падтрымкі, бо выяўляе характар развіцця рознаўзроўневых сувязей у адукацыйнай сістэме не толькі на сённяшні дзень, але і ў перспектыве.

**С.ХАНЕНЯ,**
**намеснік дэкана філалагічнага факультэта па выхаваўчай і прафарыентацыйнай рабоце.**

Канферэнцыі

# АБ ПЕДАГОГІЦЫ МАСТАЦТВА



**Канец 2000-га года выдаўся вельмі багатым на разнастайныя канферэнцыі, якія захапілі ўсё навуковае "насельніцтва" Беларусі. Не абышла бокам гэта хваля і наш універсітэт. Шмат выкладчыкаў прынялі ўдзел і выступілі з дакладамі і паведамленнямі на міжнародных, рэспубліканскіх і абласных форумах інтэлектуалаў ад навукі ва ўсіх сферах і галінах ведаў.**

Так, выкладчыкі філалагічнага факультэта нашага універсітэта і члены кафедры давузаўскай падрыхтоўкі і прафарыентацыі наведалі напрыканцы года сталіцу "беларускай Швейцарыі" г.Мазыр, дзе праходзіла Рэспубліканская навуковая канферэнцыя "Педагогіка мастацтва: гісторыя, сучасны стан, перспектывы развіцця". Пленарнае пасяджэнне адкрыў рэктар Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя Н.К.Крупскай, член-карэспандэнт Беларускай акадэміі адукацыі В.В.Валетаў.

Гэта не першае наведванне намі дружалюбнай і блізкай па духу навучальнай установы, і заўсёды калектыў яго выкладчыкаў з сардэчнасцю сустракае сваіх гасцей. Канешне, чай-кава паўза ў перапынку паміж пленарным пасяджэннем і работай секцый па розных накірунках мастацтва — вельмі важны момант для наладжвання асабістых кантактаў, шчырых навукова-дзелавых размоў. Але акрамя гэтага вельмі важнага віда зносін мазыране заўсёды імкнуцца пацешыць слых сваіх гасцей, запрашаючы на канцэрт мастацкай самадзейнасці студэнтаў і выкладчыкаў інстытута.

Гэта сутыкненне з катэгорыяй прыгожага асабліва актуальна і неабходна для нас у наш складаны і дарагі час. Арганізатары "музычнага моманту" пры падборы праграмы канцэртных выступленняў улічылі спецыфіку зместу самой канферэнцыі. Пагэтаму мы з задавальненнем слухалі арыі Анегіна і Ленскага з оперы П.І.Чайкоўскага "Я.Анегін", "Аве Марыя" Гуно, інструментальныя творы ў перакладзе для балалайкі-сола (полька "Трык-Трак" І.Штрауса), канцэрт для флейты-пікала з оперы "Чароўны стралок" К.Вэбера. Прагучалі фальклорныя і бардаўскія песні.

Затым пачалі сваю работу секцыі "па інтарэсах": праблемы мастацка-эстэтычнага выхавання ў школе і ВНУ; руская і беларуская літаратуры і літаратуразнаўчыя дысцыпліны і методыка іх выкладання ў школе і ВНУ; музыка і выяўленчае мастацтва і методыка іх выкладання ў школе і ВНУ.

Атмасфера добразычлівасці, узаемаразумення, якая прысутнічала на канферэнцыі, садзейнічала абмену меркаваннямі, схіляла да ўстанаўлення творчых і дзелавых сувязей паміж факультэтамі, да будучага супрацоўніцтва.

**Т.АЎДОНІНА,**
**дацэнт кафедры давузаўскай падрыхтоўкі і прафарыентацыі.**

*Фестивали*

# ТАИНСТВЕННЫЙ МИР ПСИХОЛОГИЧЕСКОГО ТЕАТРА



**Практически каждый из нас хотя бы раз бывал в драматическом театре, и наверняка все представляют себе, что такое театральная постановка. Однако о психологическом театре знают лишь немногие в нашей стране, и, конечно, еще меньшее количество людей смогли воочию увидеть это великолепное действо.**

Такая редкая возможность представилась тем, кто посетил фестиваль психологических театров, организованный лабораторией прикладной психологии ГГУ имени Ф.Скорины. Почему же театр называется психологическим? Мало сказать, что в постановках затрагиваются важные проблемы человеческой жизни. Представьте себе, что, находясь в зрительном зале, вы вдруг начинаете ощущать себя частью происходящего на сцене. Если герой постановки не знает, как быть в сложившейся ситуации, вы можете попытаться помочь ему, подсказать и даже поспорить. Имеете возможность сами стать героем сцены, которая рождается на ваших глазах, выбрать себе образ, наделив его определенным характером, судьбой. И постепенно как будто стирается грань между театром и реальностью. Вы словно живете новой жизнью, в новом образе, но ваши мысли, чувства остаются прежними, они лишь приобретают символический смысл. Можно долго рассуждать о проблеме жизненного выбора, можно представить себя свечой на рождественской елке и решить: догореть ли дотла, подарив весь свой свет и тепло, либо оставить огарочек, чтобы когда-нибудь, возможно, еще послужить людям. Это лишь один из образов, созданных участниками фестиваля, лишь одна из затронутых проблем. И нельзя было остаться равнодушным, когда затрагивались вопросы взаимоотношений отцов и детей, жизни и смерти, горя и радости.

Гомель на фестивале представляли три коллектива. Как рождается психологический театр, доступно, интересно показали студенты ГГУ. Свое решение проблем, наиболее важных для подростков, предложили учащиеся средней школы № 56. На суд зрителей вынес свою программу и педагогический колледж имени Выготского. Высшего накала эмоций зрители достигли, когда свою программу показал минский психологический театр "Лютея". Название вместило в себя три основных составляющих деятельности коллектива: любовь, театр, я. В коллективе театра — профессиональные психологи, которые заявили о себе не только в нашей республике, но и в России, Германии.

В основной программе фестиваля "Лютеей" был показан отрывок из спектакля "Детское одиночество". Маленькая девочка, одиноко стоящая у окна, ждет маму, наверное, не в первый и не в последний раз. Она знает, что не нужно плакать и бояться, но не может не делать этого, потому что для ребенка вечер в одиночестве — это целая вечность, и каждый раз он боится, что его одиночество не кончится никогда.

Как часто человек за повседневными заботами не замечает главного в своей жизни: слез, обид и страхов своих детей, переживаний близких, очерствения своей собственной души. А психологический театр ни к чему не принуждает, он просто делает невозможным пройти мимо самого важного в нашей жизни.

Во второй части фестиваля театр "Лютея" показал отрывок из спектакля "Межсезонье", посвященный проблеме утраты, горя в жизни человека, когда он как бы "выпадает" из времени, существует вне его, не ощущая себя частью мира. Герой спектакля — человек, его разум, душа, надежды, страхи. Перед глазами зрителя прошло все: от отчаяния и полного бессилия, до пробуждения душевных сил человека и возрождения его к новой жизни.

Потрясающий эффект воздействия достигался также с помощью великолепных декораций, которые наши гости с таким трудом привезли из Минска. Прекрасно был подобран свет, а также музыкальное сопровождение. Несколько песен лютеисты спели под гитару, и зрители были поражены великолепным исполнением. Следует отметить, что среди участников театра нет профессиональных актеров, певцов и музыкантов.

В конце вечера участники театра искренне поблагодарили устроителей фестиваля, в особенности, психолога Галину Викторовну Гатальскую, за интерес к их работе, а также зрителей за теплоту, чуткость и понимание.

Надеемся, что подобные встречи станут доброй традицией, и мы еще не раз сможем ощутить будоражащую атмосферу нового и необычного, именуемую психологическим театром.

***Галина БУСУРИНА,***
***Алеся ЛАКИШИК,***
**слушатели Института повышения квалификации и переподготовки кадров по специальности: "Практическая психология".**

## Знаёмцеся: Станіслаў Галкоўскі



Біяграфія ў Станіслава, як і ў яго равеснікаў, яшчэ вельмі кароткая. І ўсё ж ужо мае свае адметнасці.

Перад паступленнем на фізічны факультэт нашага універсітэта ён паспяхова закончыў Гомельскі гарадскі ліцэй № 1. Цяпер — студэнт 2-га курса. Вышэйшую адукацыю набывае з вялікім стараннем.

Адначасова юнак па-сапраўднаму захапляецца журналістыкай і паэзіяй, з'яўляецца акцёрам студэнцкага тэатра мініяцюр — СТЭМа.

Яго вершы друкаваліся на старонках газет "Сельмашевец", "Вячэрні Гомель", "Гомельскія ведамасці", "Гомельская праўда". Свае паэтычныя радкі ён расцэньвае як адзін са спосабаў зразумець і растлумачыць учынкі людзей, іх думкі і пачуцці.

Аб тым, што фізікі таксама бываюць лірыкамі, яскрава сведчыць падборка вершаў Станіслава, якія мы прапануем увазе нашых чытачоў.





### ЦВЕТЫ

*В цветах мы дарим настроенье,*
*Оно укутано в цветы,*
*В цветах мы ищем вдохновенье,*
*Для строк, что выше суеты.*

*В цветах язык любви и веры,*
*В цветах порывы и слова,*
*В цветах никто не знает меры,*
*От них кружится голова.*

*Цветы – они Земли награда,*
*Цветы – рыдания богов,*
*И я тебе, моя отрада,*
*Всегда цветы дарить готов.*

*Цветы растопят сердца лед,*
*Цветы соединят мосты.*
*Лишь только дождь весны пройдет,*
*Любви распустятся цветы.*

### ВСЯ НАША ЖИЗНЬ ЛИШЬ ПОВОД ДЛЯ СВИДАНЬЯ

*Вся наша жизнь лишь повод для свиданья,*
*Вся суета, к любви терновый путь.*
*Блаженны те, кто в храмах мирозданья*
*Любил и был любим когда-нибудь.*

*Весь этот мир — большое место встречи,*
*Цветы любви, они души цветы.*
*Подвластны чувству и убийцы, и предтечи,*
*Поэты, генералы и шуты.*

*И пусть ветшают камни старых зданий,*
*И гаснут свечи в храмах, тишиной скорбя.*
*Но вечны в мире Солнца и страданий*
*Три нежных слова: "Я люблю тебя".*

* * *

*Обратно белые туманы,*
*Опять торфяники болот,*
*Опять веселые дурманы*
*И поездов стучащих ход.*

*Опять я далеко от дома,*
*Опять не нужен никому,*
*Все неизвестно, незнакомо,*
*Все надо делать самому.*

*Опять измучены стаканы,*
*Гитары не дают уснуть.*
*И не вином, а чувством пьяны,*
*В глазах небесных ищем суть.*

*А в двадцать лет что еще надо,*
*Когда играет в жилах кровь.*
*И веришь: в жизни есть награда,*
*Есть настоящая любовь.*

•Спорт •Спорт •Спорт •Спорт •Спорт



## УЛАДЗІМІР ГАЛАВАЧ ПАЦВЯРДЖАЕ МАЙСТЭРСТВА

У г. Жодзіна завяршыўся чэмпіянат Беларусі па пауэрліфтынгу (сілавому трохбор'ю) сярод ветэранаў.

Чэмпіён Еўропы 2000 г. сярод ветэранаў старшы выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту, майстар спорту Уладзімір Галавач стаў чэмпіёнам не толькі ў вагавай катэгорыі да 90 кг, але і падняўся на вышэйшую прыступку п'едэстала гонару ў абсалютнай вагавай катэгорыі.

Не дзіўна, што каманда нашага універсітэта па пауэрліфтынгу заваёўвае самыя высокія ўзнагароды на абласных, гарадскіх і рэспубліканскіх спаборніцтвах, бо яе трэніруе Уладзімір Галавач і студэнтам ёсць з каго браць прыклад.



## ТЭНІСІСТЫ РАЗЫГРАЛІ ПЕРШЫНСТВА

Больш за 70 тэнісістаў прынялі ўдзел у асабістым першынстве універсітэта, якое арганізаваў і правёў старшы выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту Васіль Харытошкін.

Перамог трэцякурснік факультэта фізічнай культуры Павел Пінскі, на другім месцы — Аляксандр Іванюценка (студэнт 3 курса юрфака) і на трэцім — Ван Хайян (чацвёртакурснік матэматычнага факультэта).

**В.МАРЧАНКА.**

**Усміхніцеся** ☺☺☺☺☺☺

## АНЕКДОТ НА ТЭМУ ДНЯ

***Ідзе экзамен. Студэнт выходзіць адказваць з маленькай паперкай, на якой напісана пара кароткіх сказаў.***

Выкладчык пытаецца:

- А дзе ж ваш адказ?

- У галаве.

- А гэта што? — ківае на паперку.

- А гэта тое, што не змясцілася.



## СОЦИАЛЬНОЕ ПРЕДВИДЕНИЕ НА НОВОЕ СТОЛЕТИЕ

**Как уже сообщалось на страницах нашей газеты, недавно в издательстве "Вышэйшая школа" (Минск) вышла книга "Основы философии", автором которой является доктор философских наук, профессор, академик Международной академии акмеологических наук, академик Белорусской академии социальных наук, заведующий кафедрой философии нашего университета В.Н.Калмыков.**

**Вступив в третье тысячелетие, предлагаем вниманию читателей содержание одной из страниц — своеобразный прогноз популярного учебника.**

"Немецкий ученый Х.Групп, опираясь на итоги опроса почти 900 ученых, экономистов и других специалистов (участники опроса основывали свои прогнозы на проектах либо уже находящихся в стадии воплощения, либо на подступах к ней), дает следующий прогноз важнейших научных открытий на первые два десятилетия XXI в:

—в области техники: в обиход войдут миниатюрные видеотелефоны со встроенными компьютером и телефаксом; микропроцессоры уменьшатся в размерах в 300 раз, но подешевеют, область их применения значительно расширится; компьютеры будут переводить наиболее распространенные языки; скорость поезда на магнитной подушке превысит 1000 км в час, новый магнитно-реактивный двигатель позволит космическим кораблям землян устремиться к отдаленным планетам.

—в области энергетики: аккумуляторы машин будут заряжаться от солнечных миниэлектростанций; в пустынях и космосе построят солнечные электростанции, ток от которых пойдет в промышленно развитые районы по сверхпроводящим линиям; начнется массовое строительство жилых домов с солнечными батареями на крышах и фасадах; водород, полученный фотоэлектрическим способом, станет одним из важнейших поставщиков энергии.

—в области биологии и медицины: будет освоена новая технология обеззараживания почв с помощью микроорганизмов; будут достигнуты реальные успехи в борьбе против рака, созданы вакцины против различных его видов; хирурги научатся подключать протезы мышц и суставов к нервной системе пациента; микропроцессоры для их длительного автономного энергоснабжения подключат к живым клеткам; будут синтезированы химические препараты, стимулирующие умственную деятельность вообще и генерирование идей в особенности.

По прогнозу одной из ведущих английских аналитических исследовательских групп (1999 г.), земляне, родившиеся в XXI веке, будут жить до 120 лет и трижды связывать себя супружескими узами. Брачные контракты потеряют нынешнее значение. Их начнут заменять серии партнеров. Жители планеты предпочтут получать школьное образование с 3 лет, дважды получать высшее образование, выходить на пенсию не раньше 80 лет. Женщины ради карьеры будут откладывать рождение первого ребенка в среднем до 34 лет. Обычным для человека станет несколько мест работы, смена специальностей.

Широкое распространение получает модель "устойчивого", или "приемлемого" развития, при котором обеспечивается удовлетворение современных общественных потребностей и одновременно не ставится под угрозу способность будущих поколений полностью удовлетворять свои собственные потребности. Такая модель предполагает широкое международное сотрудничество в интересах прогресса всего человечества. Важнейшими критериями модели функционирования оптимального социально-экономического механизма (устойчивого развития) являются:

- ставка на разнообразие систем, критериев и цивилизаций;
- больше демократии, больше социальной справедливости, нежели в наиболее развитых обществах сегодня;
- гарантированные права каждого народа на самостоятельный выбор модели своего развития;
- прямое самоуправление;
- отказ от всех видов дискриминации;
- коллективизм и высокая мораль;
- саморазвитие личности как главный стимул ее активности".

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ**

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

- педагогікі — дацэнта (2);
- нямецкай мовы — выкладчыка;
- ВМ і праграміравання — дацэнта.

**Тэрмін падачы заяў — не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.**

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**



## СЕКРЕТ ДОЛГОЛЕТИЯ – В НИЗКОКАЛОРИЙНОЙ ДИЕТЕ

Сто лет назад средняя продолжительность жизни равнялась 49 годам. Сегодня она составляет около 76 лет, а в будущем может увеличиться в три раза. К такому мнению склоняются исследователи из Калифорнийского университета (США). Чтобы прожить долго, считает доктор Рой Уолфорд, необходимо придерживаться низкокалорийной диеты. Еще в 1935 году было установлено, что животное, питавшееся малокалорийной пищей, живет намного дольше своих обычных собратьев. В 60-х годах лабораторные эксперименты доказали двукратное увеличение продолжительности жизни мышей, выросших на низкокалорийном корме. Тем же, кто не собирается отказываться от тортов, пирожных и сала, остается надеяться на достижения генетиков. В случае успешных результатов в скором времени можно ожидать появления лекарств, продлевающих жизнь человека до 200, а то и 300 лет.

**"АиФ-Дайджест".**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў эканамічнага факультэта выказваюць глыбокае спачуванне старшаму выкладчыку кафедры "Фінансы і крэдыт" **ВАЙЦІШКІНАЙ Аляксандры Лаўрэнцьеўне** з выпадку напаткаўшага яе гора — смерці **БАЦЬКІ**.

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектывы матэматычнага факультэта і Франка-Беларускага інстытута кіравання выказваюць глыбокае спачуванне садырэктару названага інстытута, дацэнту кафедры матаналізу **ГАЎРЫЛЮКУ Аляксандру Уладзіміравічу** з выпадку напаткаўшага яго гора — смерці **БАЦЬКІ**.


Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Песіна, 80, пакой 2-14. Тэл. 56-30-71.

Зарэгістравана ў Дзяржкамдруку 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на фабрике "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1.

Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

Рэдактар Уладзімір БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 21
Падпісана да друку 9.01.2001